якія, ведаючы сапраўдную цану Тарасюку, даюць яму дарогу у друк. Дзякуючы ім квітнее такі графаман і цынік, як Тарасюк.

Сказавая манера апавядання дапамагае аўтару раскрыць сутнасць адмоўнага характару, паказаць адметнасць пісьменнікау і рэдактарскай працы, выявіць псіхалагічную матываванасць дзеянняў і ўчынкаў героя.

*Літаратура:*

1. Місько П. Чэрці ў коміне. Апавяданні, фельетоны, літаратурныя пародыі, аповесць. - Мн., "Маст. літ.", 1978. - С. 240.

***Шэмяцюк Л.М. (г.Брэст)***

## М.Багдановіч - версіфікатар (антычныя рэмінісцэнцыі)

Вершы Максіма Багдановіча выяўляюць уплывы на яго мастацтва антычнасці, Рэнесансу, класічнай і народна-песеннай культуры шэрагу краін Еўропы і Азіі, сучасных паэту заходнееўрапейскіх літаратурных плыняў.

Яшчэ з гімназічных часоў Багдановіч захапляўся антычнасцю. Вялікае значэнне для паэта мела гімназічная адукацыя, таму што неабходным вучэбным прадметам была антычная літаратура, а таксама дружба з выкладчыкам В.В.Белавусавым, які ведаў грэчаскую і лацінскую мовы. Багдановіча як паэта пачалі выхоўваць яшчэ з маленства. Ягоны талент развіваўся на ўзорах класічнай паэзіі, творы класікаў заўсёды былі падставай навучання ў інтэлігенцкіх сем'ях. Пасля рэвалюцыі 1905-1907 гадоў Багдановіч разумее, што пачынаецца Адраджэнне, адчувае сябе адраджэнцам. Гэтае пачуццё вымушае яго шукаць новыя для беларускай літаратуры формы. Малады паэт арыентуецца на мастацтва антычнасці, на анталагічную лірыку А.Фета. Але трэба адзначыць, што рэмінісцэнцый з вершаў Фета ў нашага аўтара няшмат. Мы знаходзім у Багдановіча толькі асобныя фетаўскія метафары, міфалагічныя вобразы антычнасці. У Фета ў большай ступені ён вучыўся ўменню спыніць імгненне, больш уважліва ўглядацца ў эмацыянальнае жыццё чалавека, яго перажыванні.

Паэзія Багдановіча жыццесцвярджальная, аптымістычная. Ёсць у ёй і сумныя ноткі, але гэты сум - агульначалавечы. Думаецца, што аптымізм Багдановіча браў свае вытокі пры ўсім пры тым і з антычнай літаратуры. Пакутнікі і героі Гамера, але яны перш за ўсё ў канчатковым выніку

аптымісты. Вельмі цяжка ўявіць, як цяжка хворы Багдановіч мог заставацца аптымістам.

М.Багдановіч выводзіў развіццё беларускай мовы, літаратуры, культуры з агульначалавечых вытокаў, а таму і пераклаў вершы Гарацыя, Авідзія, Катула, Анакрэонта, Сапфо, Вергілія і інш. Асветнік, адраджэнец, Максім Кніжнік лічыў, што без ведання гісторыі не толькі сваёй краіны, але і краін свету нельга лічыць сябе дасведчаным чалавекам. З такога погляду вынікае яго канкрэтнае назіранне пра тое, што санет на беларускай мове таксама з'яўляецца сродкам выражэння чалавечых думак, пачуццяў, як і творы старажытных аўтараў.

Багдановіч разумеў, што ў беларускую літаратуру трэба ўводзіць формы, якія прыжыліся ў іншых нацыянальных літаратурах: пентаметры, гекзаметры, трыялет, санет, актавы, тэрцыны. Ён лічыў, што калі беларуская літаратура не асвоіць некаторыя традыцыі еўрапейскай, сусветнай культуры, то застанецца на нізкім эстэтычным узроўні. Выкарыстоўваючы сусветны вопыт вершаскладання, ён прывіваў беларускай літаратуры новыя якасці: здольнасць да індывідуалізацыі лірычнага героя, узмацненне асабістага пачатку, псіхалагізацыі пісьма.

У творах Багдановіча сустракаем элементы антычнай паэтызацыі прыроды, але замест антычных багоў і міфалагічных істот у іх жывуць міфалагічныя вобразы беларускага фальклору. Цыклізацыя ў яго паэзіі таксама мае грэчаскае ці рымскае паходжанне, дапамагае паэту дасягнуць адзінства думкі.

У пейзажных вершах Багдановіч паказвае, як прырода ўплывае на чалавечую псіхіку, з'явы яе ён супастаўляе з унутраным станам чалавека. У яго вершах чалавек чысты душой і думкамі, яднаецца з прыродай, зліваецца з ёй, але давер яе людзям трэба заслужыць.

Эпічнасць - таксама яскравае сведчанне таго, што лірыка Багдановіча набліжаецца да ўзораў замежнай літаратуры. Да эпасу вяло паэта раскрыццё тэмы жыцця народа. У сувязі з гэтым ен паглыбляўся ў эпічныя традыцыі народнай творчасці, паэтызаваў не толькі народны побыт, абрады і звычаі, але і гераічны характар народа. У паэме "Максім і Магдалена" гулянка Максіма ў карчме падобная на старажытны пір; як і антычныя героі, Максім верыць у сон. Вобраз Максіма - легендарны вобраз смелага, свабодалюбнага героя, вядомага чытачу па старажытным гераічным эпасе.

Наогул, цяжка супастаўляць эпохі, у якія жылі антычныя творцы і таленавіты беларускі паэт Максім Багдановіч. Але антычныя вобразы, сродкі мастацкага выражэння думак антычных аўтараў адбіліся на эстэтычных поглядах і мастацкай практыцы класіка беларускай літаратуры.